# СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ДЫРЫЖОРСКАГА МАСТАЦТВА (народныя, духавыя і эстрадныя аркестры)

***В. М. Валатковіч,***
*загадчык кафедры духавой музыкі БДУКМ, дацэнт*

Дырыжорскае мастацтва як вышэйшы ўзровень музычнага выканальніцтва на сучасным этапе дасягнула значных якасна-творчых дасягненняў [6; 7]. Аднак, як вызначыў І. Стакоўскі, дырыжорскае мастацтва засталося адной «з самых туманных і няправільна зразумелых галін музычнага выканальніцкага мастацтва». У методыцы выкладання дырыжыравання таксама мае месца шэраг супярэчнасцей, бо пры наяўнасці шэрагу тэарэтычных распрацовак па тэхніцы дырыжыравання навучэнцу даволі складана з'арыентавацца ў прадстаўленай інфармацыі па прычыне або значнай складанасці дадзенага матэрыяла, або па прычыне недастатковай асэнсаванасці ролі тэхнікі дырыжыравання як сродку дасягнення пэўнага мастацка-выканальніцкага ўвасаблення [3, с. 63–65; 4, с. 13–14; 5, с. 54–62; 6].

Вывучэнне матэрылаў аб дзейнасці кіраўнікоў народных, духавых і эстрадных аркестраў Рэспублікі Беларусь [1], аналіз сучаснага стану дырыжорскага мастацтва кіраўнікоў розных народных, духавых і эстрадных аркестраў дазваляе зрабіць выснову аб тым, што агульны ўзровень тэхнікі дырыжорскага мастацтва пакідае жадаць лепшага. Нягледзячы на нібыта плённую канцэртна-выканальніцкую дзейнасць, такая карціна назіралася нават сярод кіраўнікоў мастацкіх інструментальных калектываў, якія маюць адпаведную спецыяльную дырыжорскую падрыхтоўку сярэдняй або нават і вышэйшай адукацыі.

Працэс асваення дырыжорскага майстэрства – справа не аднаго дня. Змест асноўных састаўных кампанентаў дырыжорскай падрыхтоўкі патрабуе пастаяннага асэнсавання і практычнага іх засваення з улікам сучасных тэндэнцый развіцця дырыжорскага мастацтва і укараненнем прагрэссіўных тэхналогій [6; 7].

У працэсе даследвання вызначанай тэмы мы прыйшлі да высновы, што такая сітуацыя складваецца з-за прабелаў у дырыжорскай падрыхтоўцы кіраўнікоў у час іх навучання ў пэўнай навучальнай установе (ССНУ, ВНУ). Несур'ёзныя адносіны да адпрацоўкі асноўных элементаў тэхнікі дырыжыравання назіраюцца часта і ў студэнтаў аркестравых спецыялізацый

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Усё гэта памнажае потым падобныя памылкі і не знаходзіць шляхоў іх прадухілення, калі такія выпускнікі ўзначальваюць свае калектывы. Такім чынам, лагічны вывад аб тым, што тэарэтычныя, тэхналагічныя і практычныя моманты комплекснай падрыхтоўкі па дырыжыраванні самым непасрэдным чынам адбіваюцца на якасці творчай дзейнасці калектываў, значыць, будуць уплываць на агульны узровень мастацкай культуры рэспублікі.

Укараненне ў сучасную канцэртна-выканальнікую і вучэбна-педагагічную практыку **дырыжорскага мастацтва сучасных тэхналогій** – актуальнае патрабаванне часу, калі ідзе гаворка аб прафессійным майстэрстве кваліфікаваных дырыжораў. Да гэтых тэхналогій мы адносім парадак пабудовы і спосаб перадачы наступных асноўных дырыжорскіх прыёмаў:

– метрычных схем (простых, складаных, змешаных);

– суадносіны і камбінацыі асноўных штрыхоў;

– суадносіны актыўных і пасіўных жэстаў;

– паказ уступу і спынення гучання;

– унутрыдолевае запаўненне дырыжорскага жэста (дуолі, трыолі, пункцірны рытм, працягласць гукаў);

– выраз дынамікі і выкарыстанне прынцыпу яе кантрасту;

выраз тэмпаў з выкарстаннем эфекта агогікі;

– паказ паўз, фермат і іх разнавіднасцей;

– мануальныя магчымасці левай рукі.

Акрамя гэтага, на ўзровень дырыжорскага мастацва, на нашу думку, акажуць уплыў і наступныя навыкі і ўменні, якімі павінны валодаць дырыжоры на аснове прафесійных ведаў аб сутнасці і тэхналогіі дырыжорскага мастацтва. Да іх адносяцца:

– дакладная передача метра;

– лагічнае адлюстраванне ў дырыжорскім жэсце гукавядзення ў аркестравых групах і аркестра ўвогуле, а таксама ва фразах і сольных эпізодах;

– аптымальная перадача дынамікі;

– дакладная перадача тэмпу;

– выразны паказ пачатку гучання;

– дакладны паказ зняццяў гучання;

– унутрыдолевае запаўненне дырыжорскага зместу;

– дакладны паказ паўз, фермат і да т.п.

Гэтыя тэхналогіі, сфарміраваныя на аснове ведаў і ўменняў, павінны набываць пэўную ступень аўтаматызаванасці і дасканалага валодання дадзеным прыёмамі (але не штампамі), відазмяняцца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

залежнасці ад канкрэтнага зместу і мастацкай драматургіі музычнага тэкста. Дадзеныя ўменні павінны быць усвядомлены, асэнсаваны ў залежнасці ад канкрэтных мастацка-выканальніцкіх задач.

Галоўную ролю ў сучасных тэхналогіях дырыжорскага мастацтва выконвае так званы дырыжорскі апарат. Пад ім маецца на ўвазе разнастайнасць рухаў рук, зведзеных ў стройную сістэму дырыжыравання, становішча корпуса, галавы і ног, мімікі, пры дапамозе якіх дырыжор перадае свае мастацкія намеры і спадзяецца на іх агульнае ўвасабленне разам з аркестрантамі. Усё знешняе аблічча дырыжора павінна дапамагаць рукам, садзейнічаць выразнасці дырыжыравання. Таму дырыжорам неабходна асабліва звярнуць увагу на адзінства ўсіх кампанентаў дырыжорскага мастацтва і тэхналагічных аспектаў, у першую чаргу – мануальную тэхніку дырыжыравання.

Мануальная тэхніка атрымала назву ад лацінскага слова «*manus*» – рука. Рукі дырыжора з'яўляюцца асноўным элементам дырыжорскага апарата, пры дапамозе якіх ён перадае інфармацыю аб метры, тэмпе, дынаміцы, штрыху. Размераныя рухі рук адлюстроўваюць метр музыкі, хуткасць іх чаргавання – тэмп, змяненні амплітуды жэста перадаюць дынаміку, а звязанасць або раздзельнасць – штрыхі.

Вывучэнне практыкі дырыжорскага мастацтва дазваляе прыйсці да вываду аб тым, што пры фарміраванні дырыжорскага апарату ў дырыжораў узнікае шэраг тыпавых тэхналагічных памылак:

– заціснутасць асобных кампанентаў дырыжорскага апарату;

– нерацыянальнае палажэнне корпуса;

– недакладная пластычнасць кампанентаў дырыжорскага апарату;

– несагласаванасць у каардынацыі дзейнасці правай і левай рук;

З мэтай выпраўлення недахопаў гэтых тэхналагічных аспектаў прапануецца наступнае:

– прааналізаваць фізіялагічную (мышачную) свабоду ўсіх кампанентаў дырыжорскага апарата;

– выкарыстаць комплекс практыкаванняў па вызваленні заціснутасці дырыжорскага апарату;

– сістэматычна і свядома выконваць практыкаванні ў памерных тэмпах;

– выкарыстоўваць магчымасці відэазапісу.

Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што толькі пры ўмове ўкаранення і выкарыстання сучасных тэхналогій, авалодання тым ці іншым тэхналагічным прыёмам, апрацоўкай да графічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакладнасці канкрэтнага элемента дырыжыравання, кіраўнік народнага, духавога ці эстраднага аркестра можа быць упэўнены, што канкрэтнасць, выразнасць, пераканаўчасць яго жэстаў дапаможа ўдзельнікам аркестравага калектыву правільна зразумець характар і раскрыць змест і творчую драматургію музычнага твора. А гэта – умовы для таго, што музычнае дырыжорска-аркестравае выканальніцкае майстэрства будзе максімальна садзейнічаць фарміраванню мастацкага густу і дырыжора, і слухачоў, развівацца на высокім якасным узроўні, садзейнічаць сацыяльнаму прэстыжу творчасці аркестраў народных, духавых і эстрадных аркестраў Рэспублікі Беларусь.

1. Асаблівасці дзейнасці аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў і ансамбляў на сучасным этапе развіцця мастацкай культуры Беларусі : навуч.-метад. дапам. – Мінск : БУК, 1994. – 106 с.

2. *Коротеев, А. Л.* Актуальные проблемы методики работы с ансамблями и оркестрами духовых и ударных инструментов (профессиональные и любительские коллективы) / А. Л. Коротеев // Оркестр. – 2005. – № 1. – С. 11–13.

3. *Мазаник, О. В.* Теоретические и исторические аспекты вузовской системы подготовки профессиональных дирижеров Беларуси (оркестровые коллективы республики) / О. В. Мазаник // Высшая школа: проблемы и перспективы: материалы VII Междунар. научн.-метод. конф., Минск, 1–2 ноября 2005 г. – Минск : РИВШ, 2005. – С. 63–65.

4. *Мазаник. О. В.* Подготовка дирижеров оркестров народных инструментов Беларуси в системе высшего музыкального образования (1930–2000) / О. В. Мазаник // Оркестр. – 2005. – № 1. – С. 13–14.

5. *Мазанік, В. У.* Айчынная музыка: станаўленне дырыжорскай адукацыі / В. У. Мазаник // Асновы мастацтва. – 1997. – Вып. 9. – С. 54–62.

6. *Маталаев, Л.* Основы дирижерской техники : метод. пособие / Л. Маталаев ; общ. ред. С. Скрипки. – М. : Сов. композитор, 1986. – 208 с. : ил., 1 л. ил.

7. *Мусин, И.* Техника дирижирования : практ. руководство / И. Мусин. – 2-е изд., доп. – СПб. : Деан – Адиа – М, 1995. – 295 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ